Заснаваны афіцыйны геральдычны сімвал Мінсувязі

Адпаведны ўказ №228 падпісаў 13 чэрвеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Згодна з якім заснаваны эмблема і сцяг Міністэрства сувязі і інфарматызацыі.

Эмблема ўяўляе сабой вобраз зямнога шара, апраўлены шэрай стужкай з беларускім арнаментам. Па-над зямным шарам намаляваны контур тэрыторыі Беларусі, у цэнтры якога - радыётрансляцыйная вышка і паштовы канверт, якія ўвасабляюць сабой асноўныя напрамкі дзейнасці Міністэрства. У ніжняй левай частцы размешчаны ў шэраг лічбы 11110100011, якія абазначаюць год стварэння ведамства (1955) у двайковым кодзе. Сцяг прайгравае выяву эмблемы, размешчанай на палотнішчы бірузовага колеру.

Крыніца: БЕЛТА

https://www.belta.by/president/view/uchrezhdeny-ofitsialnye-geraldicheskie-simvoly-minproma-i-minsvjazi-i-informatizatsii-640987-2024/

Изображение



Source URL: *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/node/9487*